arXiv:1407.2861v1 [math.NT] 10 Jul 2014

# Размеркаванне цэлых алгебраічных лікаў дадзенай ступені на рэчаіснай прамой

Каляда Д. У.

**Анатацыя**

У артыкуле атрымана асімптатычная формула для колькасці цэлых алгебраічных лікаў $\alpha$ зададзенай ступені $n$, якія маюць вышыню $H(\alpha) \leq Q$ і ляжаць у прамежку $I$, пры неабмежаваным нарастанні $Q$. Таксама паказана, што ёсць бесканечна многа прамежкаў, для якіх хібнасць асімптатычнай формулы мае парадак $O(Q^{n-1})$. Даказана, што з ростам $Q$ размеркаванне алгебраічных цэлых ступені $n$ імкнецца да размеркавання алгебраічных лікаў $(n-1)$-й ступені.

## 1 Уводзіны і галоўныя вынікі

Размеркаванне алгебраічных лікаў і, у прыватнасці, алгебраічных цэлых цікавіць навукоўцаў даволі даўно. Сярод задач у гэтай галіне разглядаюцца прыбліжэнні рэчаісных лікаў алгебраічнымі. Тут натуральным чынам узнікае паняцце рэгулярных сістэм [6]. Вынікі [6] былі палепшаны ў артыкулах [1, 8]. Развіццём гэтага напрамку даследаванняў стала пабудова рэгулярнай сістэмы алгебраічных цэлых лікаў [9].

Ёсць шэраг работ, у якіх падлічваецца асімптатычная колькасць алгебраічных лікаў з зададзенымі ступенямі і абмежаванымі мультыплікатыўнымі вышынямі ў палях пашырэнняў поля рацыянальных лікаў пры неабмежаваным нарастанні верхняй граніцы мультыплікатыўных вышынь. Напрыклад, такога роду вынікі для алгебраічных лікаў атрыманы ў працы [13], а для цэлых алгебраічных — у [7]. У рабоце [10] даказаны ацэнкі для колькасці цэлалікавых мнагачленаў зададзенай ступені з абмежаванаю Малеравай мерай. Спасылкі па тэме таксама можна знайсці ў [5, раздзел 3, §5].

Аднак поўная карціна размеркавання для вызначаных ступеней доўгі час заставалася нявысветленаю нават для рэчаісных алгебраічных лікаў другой ступені. Гэта адзначаў яшчэ ў 1985 годзе К. Малер у пісьме У. Г. Спрынджуку.

Для рэчаісных алгебраічных лікаў другой ступені такі вынік быў атрыман у [4], а для адвольнай ступені — у працах [2] і [3] (поўны доказ з некаторымі абагульненнямі можна знайсці ў [12]). У рабоце [2] паказана, што колькасць алгебраічных лікаў

ступені $n$ з вышынёй не больш за $Q$ на прамежку $[a, b)$ раўняецца

$$Q^{n+1} \int\limits_a^b \phi_n(t)\, dt + O\left(Q^n (\ln Q)^{\delta(n)}\right).$$

Тут функцыя $\phi_n(t)$ вызначаецца па формуле:

$$\phi_n(t) = \frac{1}{\zeta(n+1)} \int\limits_{\Delta_n(t)} \left| \sum_{k=1}^{n} k p_k t^{k-1} \right| dp_1 \ldots dp_n, \qquad t \in \mathbb{R}, \tag{1}$$

дзе

$$\Delta_n(t) = \left\{ (p_n, \ldots, p_1) \in \mathbb{R}^n : \max_{1 \le i \le n} |p_i| \le 1,\ p_n > 0,\ |p_n t^n + \ldots + p_1 t| \le 1 \right\},$$

$\zeta(x)$ — дзэта-функцыя Рымана. У астаткавым члене няяўная сталая сімвала $O(\cdot)$ залежыць толькі ад ступені $n$, а паказчык ступені лагарыфма раўняецца:

$$\delta(n) = \begin{cases} 1, & n \le 2, \\ 0, & n \ge 3. \end{cases}$$

Тут і далей у артыкуле пад вышынёю алгебраічнага ліку маецца на ўвазе т.зв. звычайная вышыня, якая вызначаецца як максімум абсалютных велічынь каэфіцыентаў мінімальнага мнагачлена алгебраічнага ліку.

У дадзенай працы даследуецца размеркаванне рэчаісных цэлых алгебраічных лікаў адвольнай ступені. Па сутнасці, будзе даказана, што алгебраічныя цэлыя лікі $n$-ай ступені і вышыні, не большай за $Q$, пры $Q \to \infty$ размяркоўваюцца на рэчаіснай восі амаль гэтак жа, як і алгебраічныя лікі $(n-1)$-ай ступені для тых жа вышынь.

Няхай $p(x) = a_n x^n + \ldots + a_1 x + a_0$ — мнагачлен ступені $n$, і няхай $H(p)$ — яго вышыня, вызначаная як $H(p) = \max_{0 \le i \le n} |a_i|$. Няхай $\alpha \in \mathbb{C}$ — алгебраічны лік. Мінімальным мнагачленам алгебраічнага ліку $\alpha$ будзем называць ненулявы мнагачлен $p$ найменшай ступені $\deg(p)$ з цэлымі ўзаемна простымі каэфіцыентамі, такі што $p(\alpha) = 0$. Для алгебраічнага ліку $\alpha$ яго ступень $\deg(\alpha)$ і вышыню $H(\alpha)$ вызначым як ступень і вышыню адпаведнага мінімальнага мнагачлена.

Запіс $\#M$ абазначае лік элементаў у канечным мностве $M$, а $\mathrm{mes}_k M$ абазначае $k$–мерную Лебегаву меру мноства $M \subset \mathbb{R}^d$ $(k \le d)$. Даўжыню прамежка $I$ будзем абазначаць праз $|I|$. Еўклідава норма вектара $\mathbf{x} \in \mathbb{R}^k$ абазначана праз $\|\mathbf{x}\|$. Для абазначэння асімптатычных суадносін паміж функцыямі будзем карыстацца сімвалам Вінаградава $\ll$: выраз $f \ll g$ значыць, што $f \le c\, g$, дзе $c$ — сталая, якая залежыць толькі ад ступені $n$ разглядаемых алгебраічных лікаў. Запіс $f \asymp g$ выкарыстоўваецца для асімптатычна эквівалентных функцый, г. зн. $g \ll f \ll g$. Суадносіны $f \ll_{x_1, x_2, \ldots} g$

падразумяваюць, што няяўныя сталыя залежаць толькі ад велічынь $x_1, x_2, \ldots$. Асімптатычная эквівалентнасць $f \asymp_{x_1,x_2,\ldots} g$ вызначаецца аналагічна.

Няхай сімвал $\mathcal{A}(p)$ абазначае мноства каранёў ненулявога мнагачлена $p(x)$. Вызначым $\mathcal{A}(p)$ як кратнае мноства, дзе кожны кратны корань мнагачлена $p$ ўключаны ў мноства столькі разоў, колькі яго кратнасць. Для мноства $I \subset \mathbb{R}$ праз $\mathcal{A}(p, I) := \mathcal{A}(p) \cap I$ абазначым мноства каранёў мнагачлена $p$, што ляжаць у $I$ (таксама з улікам кратнасці).

Няхай $n \in \mathbb{N}$, $Q > 1$. Вызначым наступнае мноства мнагачленаў:

$$\mathcal{U}_n(Q) = \{p(x) \in \mathbb{Z}[x] : \deg(p(x) - x^n) < n,\ H(p) \leq Q\}.$$

Няхай $\mathcal{O}_n$ — мноства алгебраічных цэлых лікаў ступені $n$. Няхай $\Omega_n(Q, x)$ абазначае колькасць рэчаісных цэлых алгебраічных лікаў ступені $n$ з вышынёю не больш за $Q$, меншых за $x$:

$$\Omega_n(Q, x) := \#\{\alpha \in \mathcal{O}_n \cap \mathbb{R} : H(\alpha) \leq Q,\ \alpha < x\}.$$

Варта заўважыць, што алгебраічныя цэлыя лікі першай ступені — гэта проста рацыянальныя цэлыя лікі, мноства якіх нідзе не шчыльнае на рэчаіснай восі. Таму далей усюды будзем лічыць, што $n \geq 2$.

Будуць даказаны наступныя дзве тэарэмы.

**Тэарэма 1.** *Існуе дадатная функцыя $\omega_n(\xi, t)$, такая што для любых $a < b$ справядліва роўнасць:*

$$\Omega_n(Q, b) - \Omega_n(Q, a) = Q^n \int\limits_a^b \omega_n(Q^{-1}, t)\, dt + R_n(Q), \tag{2}$$

*дзе $R_n(Q)$ — хібнасць, якая мае парадак*

$$R_n(Q) \ll_n \begin{cases} Q^{n-1}, & n \geq 3, \\ Q \ln Q, & n = 2. \end{cases}$$

*Пры гэтым існуюць прамежкі, для якіх астаткавы складнік $R_n(Q)$ мае парадак, не меншы за $O(Q^{n-1})$.*

*Функцыя $\omega_n(\xi, t)$ мае выгляд:*

$$\omega_n(\xi, t) = \int\limits_{\mathfrak{D}_n(\xi,t)} \left| n\xi t^{n-1} + \sum_{k=1}^{n-1} k p_k t^{k-1} \right| dp_1 \ldots dp_{n-1},$$

*дзе $\mathfrak{D}_n(\xi, t) = \{(p_1, \ldots, p_{n-1}) \in \mathbb{R}^{n-1} : |p_i| \leq 1,\ |\xi t^n + p_{n-1} t^{n-1} + \cdots + p_1 t| \leq 1\}$.*

**Тэарэма 2.** *Для любога $t \in \mathbb{R}$ справядліва гранічная роўнасць:*

$$\lim_{\xi \to 0} \omega_n(\xi, t) = \psi_n(t),$$

*дзе $\psi_n(t) := 2\zeta(n)\, \phi_{n-1}(t)$, $\zeta(t)$ — дзэта-функцыя Рымана, а $\phi_n(t)$ вызначана паводле* (1).

*Пры гэтым для $\xi < 1$ выконваецца няроўнасць*

$$|\omega_n(\xi, t) - \psi_n(t)| \ll_n \begin{cases} \xi^2 t^2, & |t| \le \kappa_1(n)\xi^{-1/2}, \\ \xi, & \kappa_1(n)\xi^{-1/2} < |t| \le \kappa_2(n)\xi^{-1}, \\ t^{-2}, & \kappa_2(n)\xi^{-1} < |t|, \end{cases} \tag{3}$$

*дзе дадатныя канстанты $\kappa_1(n)$, $\kappa_2(n)$ і няяўная сталая ў сімвале Вінаградава залежаць толькі ад $n$.*

Няроўнасць (3) паказвае, што для любых рэчаісных $t$ спраўджваецца ацэнка $|\omega_n(\xi, t) - \psi_n(t)| \ll_n \xi$, г.зн. функцыя $\omega_n(\xi, t)$ раўнамерна збягаецца да $\psi_n(t)$ пры імкненні $\xi$ да нуля.

Такім чынам, па сутнасці, тэарэма 2 сцвярджае, што гранічная шчыльнасць размеркавання рэчаісных цэлых алгебраічных лікаў ступені $n$ супадае са шчыльнасцю размеркавання рэчаісных алгебраічных лікаў ступені $n-1$.

## 2 Дапаможныя сцвярджэнні

**Лема 1.** *Няхай $\mathcal{U}_n^{**}(Q)$ — мноства прыводных унітарных цэлалікавых мнагачленаў ступені $n$ з вышынёю, не большай за $Q$. Тады справядліва асімптатычная ацэнка:*

$$\#\mathcal{U}_n^{**}(Q) \asymp_n \begin{cases} Q^{n-1}, & n \ge 3, \\ Q \ln Q, & n = 2. \end{cases}$$

Лема 1 даказваецца тым жа шляхам, што і лема 1 у [2].

**Лема 2** ([11])**.** *Няхай $\mathcal{D} \subset \mathbb{R}^d$ — абмежаваны абсяг, які складаецца з усіх пунктаў $(x_1, \ldots, x_d)$, якія задавальняюць канечнае мноства алгебраічных няроўнасцей*

$$F_i(x_1, \ldots, x_d) \ge 0, \qquad 1 \le i \le k,$$

*дзе $F_i$ — мнагачлен з рэчаіснымі каэфіцыентамі ступені $\deg F_i \le m$. Няхай*

$$\Lambda(\mathcal{D}) = \mathcal{D} \cap \mathbb{Z}^d.$$

*Тады*

$$|\#\Lambda(\mathcal{D}) - \mathrm{mes}_d\, \mathcal{D}| \le C \max(\bar{V}, 1),$$

*дзе сталая $C$ залежыць толькі ад $d$, $k$, $m$, а $\bar V$ ёсць найбольшая $r$–мерная мера праекцый мноства $\mathcal{D}$ на ўсе каардынатныя падпрасторы, якія атрымліваюцца прыроўніваннем $d-r$ каардынат пунктаў у $\mathcal{D}$ нулю, $r$ прабягае ўсе значэнні ад 1 да $d-1$, г.зн.,*

$$\bar V(\mathcal{D}) := \max_{1\le r<d}\left\{\bar V_r(\mathcal{D})\right\}, \quad \bar V_r(\mathcal{D}) := \max_{\substack{\mathcal{J}\subset\{1,\ldots,d\}\\ \#\mathcal{J}=r}}\left\{\mathrm{mes}_r\,\mathrm{Proj}_{\mathcal{J}}\,\mathcal{D}\right\},$$

*дзе $\mathrm{Proj}_{\mathcal{J}}\,\mathcal{D}$ — артаганальная праекцыя вобласці $\mathcal{D}$ на каардынатную падпрастору, утвораную каардынатамі з індэксамі ў $\mathcal{J}$.*

**Лема 3.** *Няхай $n\ge 2$, $\xi$ — сталы дадатны лік. Няхай вектары $(a_n,\ldots,a_1,a_0)$ і $(b_{n-2},\ldots,b_1,b_0,\alpha,\beta)$ звязаны тоеснасцю*

$$\xi x^n + \sum_{k=0}^{n-1} a_k x^k = (x-\alpha)(x-\beta)\left(\xi x^{n-2} + \sum_{m=0}^{n-3} b_m x^m\right). \tag{4}$$

*Тады ў матрычнай форме гэта сувязь выглядае наступным чынам:*

$$\begin{pmatrix}\xi\\ a_{n-1}\\ a_{n-2}\\ \vdots\\ a_1\\ a_0\end{pmatrix} = \begin{pmatrix} 1 & & & 0\\ -(\alpha+\beta) & 1 & & \\ \alpha\beta & -(\alpha+\beta) & \ddots & \\ & \alpha\beta & & 1\\ & & \ddots & -(\alpha+\beta)\\ 0 & & & \alpha\beta\end{pmatrix}\cdot\begin{pmatrix}\xi\\ b_{n-3}\\ \vdots\\ b_1\\ b_0\end{pmatrix}, \tag{5}$$

*а якабіян такой замены каардынат раўняецца*

$$\det J = \left|\frac{\partial(a_{n-1},\ldots,a_2,a_1,a_0)}{\partial(b_{n-3},\ldots,b_0;\alpha,\beta)}\right| = (\beta-\alpha)\cdot g(\mathbf{b},\alpha)\cdot g(\mathbf{b},\beta),$$

*дзе $g(\mathbf{b},x) := \xi x^{n-2} + b_{n-3}x^{n-3} + \ldots + b_1 x + b_0$.*

Заўвага: пры $n=2$ якабіян роўны $\xi^2(\beta-\alpha)$.

Доказ лемы 3 вядзецца па шляху доказаў лем 1, 2, 3 у [3].

**Лема 4.** *Няхай $I\subset\mathbb{R}$ — канечны прамежак, $|I|\le 1$. Няхай $\widehat{\mathcal{G}}_n(\xi,k,I)$ — мноства мнагачленаў ступені $n$ і вышыні, не большай за 1, са старшым каэфіцыентам $\xi$, $0<\xi\le 1$, якія маюць роўна $k$ каранёў на мностве $I$. Тады*

$$\mathrm{mes}_n \bigcup_{k=2}^{n} \widehat{\mathcal{G}}_n(\xi,k,I) \le \lambda(n)\left(\xi+\rho^{-3}\right)^2|I|^3,$$

*дзе $\rho = \max(1, |\alpha+\beta|/2)$, а $\lambda(n)$ — пастаянная, якая залежыць толькі ад $n$.*

**Доказ.** Абазначым $\mathcal{M} := \bigcup_{k=2}^{n} \widehat{\mathcal{G}}_n(\xi, k, I)$. Ацэнім зверху аб'ём

$$\operatorname{mes}_n \mathcal{M} = \int\limits_{\mathcal{M}} d\mathbf{a}.$$

Любы мнагачлен $p(x)$ з мноства $\mathcal{M}$ можна запісаць у выглядзе

$$p(x) = \xi x^n + a_{n-1}x^{n-1} + \ldots + a_0 = (x-\alpha)(x-\beta)(\xi x^{n-2} + b_{n-3}x^{n-3} + \ldots + b_0),$$

дзе $\alpha, \beta \in I$.

Зробім замену каардынат (5). Пры гэтым умова $\mathbf{a} \in \mathcal{M}$ раўназначная сістэме няроўнасцей

$$\begin{cases} |a_{n-1}| = |b_{n-3} - (\alpha+\beta)\xi| \le 1, \\ |a_{n-2}| = |b_{n-4} - (\alpha+\beta)b_{n-3} + \alpha\beta\xi| \le 1, \\ |a_k| = |b_{k-2} - (\alpha+\beta)b_{k-1} + \alpha\beta b_k| \le 1, \quad k = 2, \ldots, n-3, \\ |a_1| = |-(\alpha+\beta)b_0 + \alpha\beta b_1| \le 1, \\ |a_0| = |\alpha b_0| \le 1, \\ a \le \alpha < b, \\ a \le \beta < b. \end{cases} \tag{6}$$

Згодна з лемаю 3, атрымліваем

$$\operatorname{mes}_{n+1} \mathcal{M}(I) \le \int\limits_{\mathcal{M}^*(I)} |\alpha - \beta| \cdot |g(\mathbf{b}, \alpha)\, g(\mathbf{b}, \beta)|\, d\mathbf{b}\, d\alpha\, d\beta, \tag{7}$$

дзе $\mathcal{M}^*(I)$ — новая вобласць інтэгравання, вызначаная няроўнасцямі (6), а $g(\mathbf{b}, x) = \xi x^{n-2} + \ldots + b_1 x + b_0$. Варта падкрэсліць, што тут замест роўнасці стаіць няроўнасць. Прычына гэтага ў тым, што мнагачлен, у якога $k > 2$ каранёў на прамежку $I$, можна прадставіць $\binom{k}{2}$ рознымі спосабамі ў выглядзе (4).

Перапішам кратны інтэграл у (7) наступным чынам:

$$\operatorname{mes}_{n+1} \mathcal{M}(I) \le \int\limits_{I \times I} |\alpha - \beta|\, d\alpha\, d\beta \int\limits_{\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)} |g(\mathbf{b}, \alpha) g(\mathbf{b}, \beta)|\, d\mathbf{b},$$

дзе $\mathcal{M}^*(\alpha, \beta)$ — мноства вектараў $\mathbf{b} \in \mathbb{R}^{n-1}$, якія задавальняюць сістэму няроўнасцей (6).

Каб ацаніць унутраны інтэграл, дастаткова ацаніць зверху меру $\operatorname{mes}_{n-2} \mathcal{M}^*(\alpha, \beta)$ і функцыю $G(\mathbf{b}, \alpha, \beta) := g(\mathbf{b}, \alpha)\, g(\mathbf{b}, \beta)$ для $\mathbf{b} \in \mathcal{M}^*(\alpha, \beta)$. Разглядзім два выпадкі.

1) Няхай $|a + b|/2 \le 1$.

Ацэнім меру $\operatorname{mes}_{n-2}\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)$ з дапамогаю матрычнай роўнасці, якая вынікае непасрэдна з (5):

$$\begin{pmatrix} a_{n-1}-c_1\xi \\ a_{n-2}-c_0\xi \\ \vdots \\ a_3 \\ a_2 \end{pmatrix} = \begin{pmatrix} c_2 & & & & 0 \\ c_1 & c_2 & & & \\ c_0 & c_1 & \ddots & & \\ \vdots & \vdots & \ddots & c_2 & \\ & & \dots & c_1 & c_2 \end{pmatrix} \cdot \begin{pmatrix} b_{n-3} \\ b_{n-4} \\ \vdots \\ b_1 \\ b_0 \end{pmatrix}, \tag{8}$$

дзе $c_0=\alpha\beta$, $c_1=-(\alpha+\beta)$, $c_2=1$.

Вобраз вобласці $\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)$ у каардынатах $(a_{n-1},\dots,a_3,a_2)$ пасля дамнажэння на матрыцу ў (8) заключаны ў паралелепіпедзе адзінкавага аб'ёму. Вызначнік матрыцы ў (8) раўняецца адзінцы. Адсюль маем верхнюю ацэнку для меры

$$\operatorname{mes}_{n-2}\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)\le 1.$$

Ацэнім цяпер абсалютную велічыню функцыі $G(\mathbf{b},\alpha,\beta)$ на мностве $\mathbf{b}\in\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)$. Для гэтага ацэнім найбольшыя значэнні каардынат $b_{n-3},\dots,b_1,b_0$ у абсягу $\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)$.

Улічваючы, што $|a+b|/2\le 1$ і $0<b-a\le 1$, маем наступную ацэнку для каэфіцыентаў матрыцы ў тоеснасці (8):

$$\max_{0\le i\le 2}|c_i|=O(1).$$

Пачынаючы з $b_{n-3}$, паслядоўна выражаем каэфіцыенты $b_i$ і па індукцыі атрымліваем

$$\max_{0\le i\le n-3}|b_i|\ll_n 1.$$

Адсюль адразу ж вынікае, што $|G(\mathbf{b},\alpha,\beta)|\ll_n 1$ для любых $\mathbf{b}\in\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)$.

Такім чынам, пры $|a+b|/2\le 1$ для любых $\alpha,\beta\in[a,b)$ атрымліваем

$$\int\limits_{\mathcal{M}^*(\alpha,\beta)} |G(\mathbf{b},\alpha,\beta)|\,d\mathbf{b}\ \ll_n\ 1.$$

У выніку, пры $|a+b|/2\le 1$ справядліва ацэнка

$$\operatorname{mes}_{n+1}\mathcal{M}(I)\ll_n |I|^3. \tag{9}$$

2) Няхай цяпер $|a+b|/2>1$.

З роўнасці (5) маем

$$\begin{pmatrix} a_{n-3} \\ a_{n-4} \\ \vdots \\ a_1 \\ a_0 \end{pmatrix} = \begin{pmatrix} c_0 & c_1 & \dots & & \\ & c_0 & \ddots & \vdots & \vdots \\ & & \ddots & c_1 & c_2 \\ & & & c_0 & c_1 \\ 0 & & & & c_0 \end{pmatrix} \cdot \begin{pmatrix} b_{n-3} \\ b_{n-4} \\ \vdots \\ b_1 \\ b_0 \end{pmatrix}, \tag{10}$$

дзе $c_0 = \alpha\beta$, $c_1 = -(\alpha+\beta)$, $c_2 = 1$.

Адсюль атрымліваем верхнюю ацэнку для меры

$$\mathrm{mes}_{n-2}\,\mathcal{M}^*(\alpha,\beta) \le |\alpha\beta|^{-n+2}.$$

Ацэнім найбольшае абсалютнае значэнне функцыі $G(\mathbf{b},\alpha,\beta)$. Для гэтага знойдзем верхнія ацэнкі абсалютных велічынь каэфіцыентаў $b_i$.

Для каэфіцыентаў $c_i$ у (10) справядліва наступная ацэнка:

$$c_0 \asymp \rho^2, \quad c_1 = O(\rho), \quad c_2 = 1,$$

дзе $\rho = |a+b|/2$. Тут таксама ўлічана, што $0 < b - a \le 1$.

Цяпер па індукцыі ацэнім зверху $b_i$. З (10) маем

$$\begin{aligned}|b_0| &= |c_0|^{-1}|a_0| = O(\rho^{-2}),\\ |b_1| &= |c_0|^{-1}|a_1 - c_1 b_0| = O(\rho^{-2})\,O(1+\rho^{-1}) = O(\rho^{-2}).\end{aligned}$$

Працягваючы па індукцыі для $i = 2, 3, \ldots, n-3$, атрымліваем

$$|b_i| = |c_0|^{-1}|a_i - c_1 b_{i-1} - c_2 b_{i-2}| = O(\rho^{-2})\,O(1+\rho^{-1}+\rho^{-2}) = O(\rho^{-2}),$$

дзе няяўныя сталыя ў сімвале $O(\cdot)$ залежаць толькі ад $n$.

Адсюль для любых $x \in [a,b)$ атрымліваем $|g(\mathbf{b},x)| = O(\xi\rho^{n-2} + \rho^{n-5})$, і ў выніку

$$|G(\mathbf{b},\alpha,\beta)| = O\left(\rho^{2(n-2)}\left(\xi+\rho^{-3}\right)^2\right).$$

Такім чынам, атрымліваем

$$\mathrm{mes}_n\,\mathcal{M} \le \lambda(n)\left(\xi+\rho^{-3}\right)^2|I|^3.$$

Лема даказана. □

**Лема 5** ([2])**.** *Няхай $\alpha = a/b$ — нескарачальны дроб, $a \in \mathbb{Z}$, $b \in \mathbb{N}$. Тады на адрэзку $[\alpha - r_0,\ \alpha + r_0]$, дзе*

$$r_0 = r_0(\alpha, Q) = \frac{\kappa(n)}{b^n Q},$$

*$\kappa(n)$ — эфектыўная пастаянная, няма ні аднаго алгебраічнага ліку $n$-й ступені з вышынёй, не большай за $Q$.*

**Лема 6.** *Няхай $V \subset \mathbb{R}^k$ — абмежаваная вобласць, сіметрычная адносна пачатку каардынат. Няхай $\mathbf{v} = (v_1,\ldots,v_k)$ — некаторы сталы ненулявы вектар, а $\epsilon > 0$ — некаторы лік. Тады*

$$0 < \int\limits_V |\mathbf{v}\cdot\mathbf{x}+\epsilon|\,d\mathbf{x} - \int\limits_V |\mathbf{v}\cdot\mathbf{x}|\,d\mathbf{x} \ \le\ \epsilon\cdot\mathrm{mes}_k\,V(\epsilon),$$

*дзе*

$$V(\epsilon) := \{\mathbf{x}\in V : |\mathbf{v}\cdot\mathbf{x}| < \epsilon\}.$$

**Лема 7.** *Няхай* $\mathbf{a} = (a_1, \dots, a_k)$ *і* $\mathbf{b} = (b_1, \dots, b_k)$ *— некаторыя сталыя некалінеарныя вектары. Няхай вобласць* $V \subset \mathbb{R}^k$ *зададзена сістэмай няроўнасцей*

$$\begin{cases} |\mathbf{a}\cdot\mathbf{x}| \le H_1, \\ |\mathbf{b}\cdot\mathbf{x}| \le H_2, \end{cases}$$

*дзе* $\mathbf{x} = (x_1, \dots, x_k) \in \mathbb{R}^k$ *— радыус-вектар.*

*Тады плошча сячэння* $\mathcal{S}$ *вобласці* $V$ *лінейнаю абалонкай вектараў* $\mathbf{a}$ *і* $\mathbf{b}$ *раўняецца*

$$\operatorname{mes}_2 \mathcal{S} = \frac{4H_1H_2}{\sqrt{\mathbf{a}^2\mathbf{b}^2 - (\mathbf{a}\cdot\mathbf{b})^2}},$$

*а для дыяметра сячэння справядліва няроўнасць*

$$\frac{\sqrt{\mathbf{b}^2H_1^2 + \mathbf{a}^2H_2^2}}{\sqrt{\mathbf{a}^2\mathbf{b}^2 - (\mathbf{a}\cdot\mathbf{b})^2}} \le \operatorname{diam}\mathcal{S} \le \frac{\|\mathbf{b}\|H_1 + \|\mathbf{a}\|H_2}{\sqrt{\mathbf{a}^2\mathbf{b}^2 - (\mathbf{a}\cdot\mathbf{b})^2}}.$$

# 3 Доказ асноўнай тэарэмы

Няхай $I = [\alpha, \beta)$ — канечны прамежак. Абазначым праз $\mathcal{N}_n(Q, k, I)$ колькасць непрыводных унітарных мнагачленаў $n$-й ступені з вышынёй не большай чым $Q$, якія маюць роўна $k$ каранёў на мностве $I$. Нескладана заўважыць, што

$$\Omega_n(Q, \beta) - \Omega_n(Q, \alpha) = \sum_{k=1}^{n} k\, \mathcal{N}_n(Q, k, I). \tag{11}$$

Мноства рэчаісных мнагачленаў ступені $n$ і вышыні не больш чым 1 са старшым каэфіцыентам $\xi$, якія маюць роўна $k$ каранёў на мностве $S$, абазначым як

$$\widehat{\mathcal{G}}_n(\xi, k, S) := \left\{ p \in \mathbb{R}[x] : \deg(p(x) - \xi x^n) < n,\ H(p) \le 1,\ \#\mathcal{A}(p, S) = k \right\}.$$

З лем 1 і 2 вынікае

$$\mathcal{N}_n(Q, k, I) = Q^n \operatorname{mes}_n \widehat{\mathcal{G}}_n(Q^{-1}, k, I) + R_n(Q), \tag{12}$$

дзе $R_n(Q) = O(Q^n)$ пры $n \ge 3$, і $R_n(Q) = O(Q \ln Q)$ пры $n = 2$; няяўныя пастаянныя ў сімвале $O(\cdot)$ залежаць толькі ад $n$.

Нескладана пераканацца, што для любога $0 < \xi \le 1$ функцыя

$$\Upsilon_n(\xi, S) := \sum_{k=1}^{n} k \operatorname{mes}_n \widehat{\mathcal{G}}_n(\xi, k, S)$$

адытыўная і абмежаваная на мностве ўсіх падмностваў $S \subseteq \mathbb{R}$. Адсюль вынікае, што можна вызначыць функцыю

$$\widehat{\Omega}_n(\xi, x) := \Upsilon_n\left(\xi, (-\infty, x)\right),$$

для якой будзе справядліва

$$\widehat{\Omega}_n(\xi, \beta) - \widehat{\Omega}_n(\xi, \alpha) = \sum_{k=1}^{n} k \operatorname{mes}_n \widehat{\mathcal{G}}_n(\xi, k, I). \tag{13}$$

Пакажам, што $\widehat{\Omega}_n(\xi, x)$ дыферэнцавальная па $x$. Няхай

$$\mathcal{D}(I) = \mathcal{D}(\xi, I) = \{\mathbf{p} \in \mathbb{R}^{n+1} : p_n = \xi,\ p(\alpha)p(\beta) < 0,\ H(p) \le 1\},$$

дзе $\mathbf{p} = (\xi, p_{n-1}, \ldots, p_1, p_0)$ — вектар каэфіцыентаў мнагачлена $p(x) = \xi x^n + \ldots + p_1 x + p_0$, а $\xi = Q^{-1}$. Відавочна, любы мнагачлен з вобласці $\mathcal{D}$ мае няцотны лік каранёў на прамежку $I$.

З лемы 4 маем

$$\widehat{\Omega}_n(\xi, \beta) - \widehat{\Omega}_n(\xi, \alpha) = \operatorname{mes}_n \mathcal{D}(\xi, I) + O(|I|^3), \tag{14}$$

дзе няяўная сталая ў сімвале $O(\cdot)$ залежыць толькі ад $n$.

Цяпер нам трэба вылічыць

$$\operatorname{mes}_n \mathcal{D}(\xi, I) = \int\limits_{\mathcal{D}(\xi, I)} dp_0\, dp_1 \ldots dp_{n-1}.$$

Вобласць $\mathcal{D}(\xi, I)$ можна вызначыць наступнай сістэмай няроўнасцей

$$\begin{cases} \|\mathbf{p}\|_\infty \le 1, \quad p_n = \xi = Q^{-1}, \\ p_0 \ge \min\{-p_n\alpha^n - \ldots - p_1\alpha,\ -p_n\beta^n - \ldots - p_1\beta\}, \\ p_0 \le \max\{-p_n\alpha^n - \ldots - p_1\alpha,\ -p_n\beta^n - \ldots - p_1\beta\}. \end{cases}$$

Вызначым функцыю

$$h(p_n, \ldots, p_1) = h(I; p_n, \ldots, p_1) := \left| \sum_{k=1}^{n} p_k(\beta^k - \alpha^k) \right| = (\beta - \alpha) \left| \sum_{k=1}^{n} p_k \sum_{i=0}^{k-1} \alpha^i \beta^{k-i-1} \right|,$$

і разгледзім абсяг

$$\mathfrak{D}(\xi, t) := \left\{(p_1, \ldots, p_{n-1}) \in \mathbb{R}^{n-1} : |p_i| \le 1,\ |\xi t^n + p_{n-1}t^{n-1} + \cdots + p_1 t| \le 1\right\}.$$

Нескладана заўважыць, што

$$\int\limits_{\mathfrak{D}_*(\xi;\alpha,\beta)} h(\xi, p_{n-1}, \dots, p_1)\, dp_{n-1}\dots dp_1 \;\le\; \operatorname{mes}_n \mathcal{D}(I) \;\le \int\limits_{\mathfrak{D}^*(\xi;\alpha,\beta)} h(\xi, p_{n-1}\dots, p_1)\, dp_{n-1}\dots dp_1,$$

дзе

$$\mathfrak{D}_*(\xi;\alpha,\beta) := \mathfrak{D}(\xi,\alpha)\cap\mathfrak{D}(\xi,\beta), \qquad \mathfrak{D}^*(\xi;\alpha,\beta) := \mathfrak{D}(\xi,\alpha)\cup\mathfrak{D}(\xi,\beta).$$

Няхай $\beta\to\alpha$. Пасля разлікаў атрымліваем для любога $\alpha\in\mathbb{R}$

$$\lim_{\beta\to\alpha}\frac{\operatorname{mes}_n \mathcal{D}(I)}{(\beta-\alpha)} \;=\; \int\limits_{\mathfrak{D}(\xi,\alpha)} \left| n\xi\alpha^{n-1} + \sum_{k=1}^{n-1} kp_k\alpha^{k-1}\right| dp_{n-1}\dots dp_1 \;>\; 0, \tag{15}$$

або, інакш кажучы,

$$\operatorname{mes}_n \mathcal{D}(I) = \omega_n(\xi,\alpha)|I| + o(|I|),$$

дзе $\omega_n(\xi,\alpha)$ мае выгляд (15).

Адсюль, улічваючы (14), атрымліваем, што функцыя $\widehat{\Omega}_n(\xi,x)$ дыферэнцавальная па $x$, і $\omega_n(\xi,x)$ — яе вытворная. Такім чынам, маем

$$\widehat{\Omega}_n(\xi,\beta) - \widehat{\Omega}_n(\xi,\alpha) = \int\limits_{\alpha}^{\beta} \omega_n(\xi,x)\, dx.$$

У выніку, збіраючы разам (11), (12) і (13), атрымліваем сцвярджэнне асноўнай тэарэмы. З лемы 5 вынікае, што існуе бесканечна многа прамежкаў $I$, для якіх пагрэшнасць асімптатычнае формулы (2) мае парадак $O(Q^{n-1})$.

# 4 Доказ гранічнай роўнасці

У гэтым раздзеле будзем лічыць $t\ge 0$. Улічваючы цотнасць функцыі $\omega_n(\xi,t)$, для адмоўных $t$ усё будзе тое самае.

Каб спрасціць запіс разлікаў, увядзём наступныя абазначэнні

$$\begin{aligned}
\mathbf{p} &:= (p_1,\dots,p_{n-1}), \quad d\mathbf{p} := dp_1\, dp_2\dots dp_{n-1},\\
\mathbf{w}(t) &:= \left(t, t^2, \dots, t^{n-1}\right),\\
\mathbf{v}(t) &:= \left(1, 2t, \dots, (n-1)t^{n-2}\right) = \frac{d}{dt}\mathbf{w}(t).
\end{aligned}$$

Разгледзім функцыю

$$\psi_n(t) := 2\zeta(n)\phi_{n-1}(t) = \int\limits_{\widetilde{\mathfrak{D}}_n(t)} |\mathbf{v}(t)\cdot\mathbf{p}|\; d\mathbf{p}, \qquad t\in\mathbb{R},$$

дзе

$$\widetilde{\mathfrak{D}}_n(t) = \{\mathbf{p} \in \mathbb{R}^{n-1} : \|\mathbf{p}\|_\infty \le 1,\ |\mathbf{w}(t)\cdot\mathbf{p}| \le 1\},$$

$\zeta(x)$ — дзэта-функцыя Рымана.

Заўвага: вобласць $\widetilde{\mathfrak{D}}_n(t)$ адрозніваецца ад вобласці $\Delta_{n-1}(t)$ адсутнасцю ўмовы $p_{n-1} > 0$, а ад вобласці $\mathfrak{D}_n(\xi,t)$ — адсутнасцю складніка $\xi t^n$ пад модулем у няроўнасці.

У інтэграле для функцыі $\omega_n(\xi,t)$ зробім замену зменных:

$$\begin{cases} p_i = q_i, & i = 1,\dots,n-2,\\ p_{n-1} = q_{n-1} - \xi t. \end{cases}$$

У выніку інтэграл прыме выгляд:

$$\omega_n(\xi,t) = \int\limits_{\mathfrak{S}_n(\xi,t)} \left|\xi t^{n-1} + \sum_{k=1}^{n-1} k q_k t^{k-1}\right| dq_1\dots dq_{n-1}, \qquad t\in\mathbb{R},$$

дзе

$$\mathfrak{S}_n(\xi,t) = \left\{ (q_1,\dots,q_{n-1}) \in \mathbb{R}^{n-1} : \max_{1\le i\le n-2} |q_i| \le 1,\ \begin{array}{l} |q_{n-1} - \xi t| \le 1, \\ |q_{n-1}t^{n-1} + \ldots + q_1 t| \le 1 \end{array} \right\}.$$

Распісваючы інтэграл на складнікі, маем

$$\omega_n(\xi,t) = \int\limits_{\widetilde{\mathfrak{D}}_n(t)} \left|\xi t^{n-1} + \mathbf{v}(t)\mathbf{q}\right| d\mathbf{q} + \\ + \int\limits_{\mathfrak{S}_n^+(\xi,t)} \left|\xi t^{n-1} + \mathbf{v}(t)\mathbf{q}\right| d\mathbf{q} - \int\limits_{\mathfrak{S}_n^-(\xi,t)} \left|\xi t^{n-1} + \mathbf{v}(t)\mathbf{q}\right| d\mathbf{q},$$

дзе

$$\mathfrak{S}_n^+(\xi,t) = \left\{ \mathbf{q} \in \mathbb{R}^{n-1} : |\mathbf{w}(t)\mathbf{q}| \le 1,\ \max_{1\le i\le n-2} |q_i| \le 1,\quad 1 < q_{n-1} \le 1 + \xi t \right\},$$

$$\mathfrak{S}_n^-(\xi,t) = \left\{ \mathbf{q} \in \mathbb{R}^{n-1} : |\mathbf{w}(t)\mathbf{q}| \le 1,\ \max_{1\le i\le n-2} |q_i| \le 1,\ -1 \le q_{n-1} < -1 + \xi t \right\}.$$

Дзеля зручнасці абазначым інтэграл па $\widetilde{\mathfrak{D}}_n(t)$ праз $J_1$, па $\mathfrak{S}_n^+(\xi,t)$ — праз $J_2$, а па $\mathfrak{S}_n^-(\xi,t)$ — праз $J_3$. Такім чынам,

$$\omega_n(\xi,t) = J_1 + J_2 - J_3.$$

1) Ацэнка рознасці $J_2 - J_3$.

Для вобласці $\mathfrak{S}_n(\xi, t)$ маем

$$\begin{cases} -1+\xi t \le q_{n-1} \le 1+\xi t, \\ \frac{-1-q_1 t-\cdots-q_{n-2}t^{n-2}}{t^{n-1}} \le q_{n-1} \le \frac{1-q_1 t-\cdots-q_{n-2}t^{n-2}}{t^{n-1}}. \end{cases}$$

Улічваючы, што

$$\min_{\substack{|q_i|\le 1\\ 1\le i\le n-2}} \frac{-1-q_1 t-\cdots-q_{n-2}t^{n-2}}{t^{n-1}} = -\sum_{k=1}^{n-1} t^{-k},$$

атрымліваем, што пры выкананні ўмовы

$$-\sum_{i=1}^{n-1} t^{-k} \ge -1+\xi t \tag{16}$$

абмежаванне $|q_{n-1}-\xi t| \le 1$ будзе залішняе.

Лёгка заўважыць, што пры $0<\xi<1/8$ няроўнасць (16) вызначае прамежак $[t_1, t_2]$ на дадатнай паўвосі. Пры імкненні $\xi$ да нуля, для граніц прамежка выконваюцца асімптатычныя суадносіны

$$t_1 \asymp_n 1, \qquad t_2 \asymp_n \xi^{-1}.$$

Разаб'ём значэнні $t$ на тры прамежкі: $[0, t_1)$, $[t_1, t_2)$, $[t_2, +\infty)$.

а) Няхай $0 \le t < t_1$.

У інтэграле $J_2$ зробім замену $q_{n-1} = 1+\theta$. У інтэграле $J_3$ паслядоўна ажыццявім замену $\mathbf{q} \to -\mathbf{q}$, а затым замену $q_{n-1} = 1-\theta$. Пры гэтым $0<\theta<\xi t$. У выніку атрымаем

$$J_2 = \int\limits_{\widetilde{\mathfrak{S}}_n^+(\xi,t)} \left|\xi t^{n-1} + (n-1)(1+\theta)t^{n-2} + \sum_{k=1}^{n-2} k q_k t^{k-1}\right| dq_1\, dq_2 \ldots dq_{n-2}\, d\theta,$$

$$J_3 = \int\limits_{\widetilde{\mathfrak{S}}_n^-(\xi,t)} \left|-\xi t^{n-1} + (n-1)(1-\theta)t^{n-2} + \sum_{k=1}^{n-2} k q_k t^{k-1}\right| dq_1\, dq_2 \ldots dq_{n-2}\, d\theta,$$

дзе

$$\widetilde{\mathfrak{S}}_n^+(\xi,t) = \left\{(q_1,\ldots,q_{n-2},\theta)\in\mathbb{R}^{n-1} : \left|\sum_{k=1}^{n-2} q_k t^k + (1+\theta)t^{n-1}\right| \le 1,\ \max_{1\le i\le n-2}|q_i|\le 1,\ 0\le\theta\le\xi t\right\},$$

$$\widetilde{\mathfrak{S}}_n^-(\xi,t) = \left\{(q_1,\ldots,q_{n-2},\theta)\in\mathbb{R}^{n-1} : \left|\sum_{k=1}^{n-2} q_k t^k + (1-\theta)t^{n-1}\right| \le 1,\ \max_{1\le i\le n-2}|q_i|\le 1,\ 0\le\theta\le\xi t\right\}.$$

Для меры сіметрычнай рознасці і перасячэння абласцей $\widetilde{\mathfrak{S}}_n^-(\xi,t)$ і $\widetilde{\mathfrak{S}}_n^+(\xi,t)$ справядлівыя няроўнасці

$$\operatorname{mes}_{n-1}\left(\widetilde{\mathfrak{S}}_n^-(\xi,t)\,\Delta\,\widetilde{\mathfrak{S}}_n^+(\xi,t)\right) \ll_n \xi^2 t^n,$$
$$\operatorname{mes}_{n-1}\left(\widetilde{\mathfrak{S}}_n^-(\xi,t)\cap\widetilde{\mathfrak{S}}_n^+(\xi,t)\right) \ll_n \xi t.$$

Рознасць падынтэгральных функцый па перасячэнні абласцей $\widetilde{\mathfrak{S}}_n^-(\xi,t)\cap\widetilde{\mathfrak{S}}_n^+(\xi,t)$ не большая за $2n\xi t^{n-1}$. Таму, улічваючы, што падынтэгральныя функцыі абмежаваныя на абласцях інтэгравання, пры $t\in[0,t_1)$ атрымліваем

$$|J_2-J_3| \ll_n \xi^2 t^n.$$

б) Для $t\in[t_1,t_2)$ справядліва роўнасць $\mathfrak{S}_n(\xi,t)=\widetilde{\mathfrak{D}}_n(t)$, і такім чынам,

$$J_2=J_3=0.$$

в) Пры $t\ge t_2$ маем

$$J_2=0,\quad 0\le J_3\le J_1.$$

На гэтым прамежку інтэграл $J_3$ ацэньваецца як

$$J_3 \;\le\; \left(\xi t^{n-1}+\sum_{k=1}^{n-1} k t^{k-1}\right)\operatorname{mes}_{n-1}\mathfrak{S}_n^-(\xi,t) \;\ll_n\; \xi+\frac{1}{t} \;\ll_n\; \xi.$$

Для $t\ge t_3$, дзе $t_3$ ёсць дадатны корань ураўнення

$$\sum_{k=1}^{n-1} t^{-k} = -1+\xi t,$$

будзе выконвацца роўнасць $J_1=J_3$ і, як вынік, $\omega_n(\xi,t)=0$. Для $t_3$ справядліва ацэнка

$$t_3\le\frac{1}{\xi}+\xi.$$

2) Ацэнка рознасці $J_1-\psi_n(t)$.

Па леме 6 маем

$$0<J_1-\psi_n(t)\le \xi t^{n-1}\operatorname{mes}_{n-1}U_n(\xi,t),$$

дзе

$$U_n(\xi,t)=\left\{\mathbf{q}\in\mathbb{R}^{n-1}:\|\mathbf{q}\|_\infty\le 1,\ |\mathbf{w}(t)\mathbf{q}|\le 1,\ |\mathbf{v}(t)\mathbf{q}|\le\xi t^{n-1}\right\}.$$

Абазначым праз $\mathcal{S}$ сячэнне «бруска» $\{\mathbf{q}\in\mathbb{R}^{n-1}:|\mathbf{w}(t)\mathbf{q}|\le 1,\ |\mathbf{v}(t)\mathbf{q}|\le\xi t^{n-1}\}$ лінейнаю абалонкай вектараў $\mathbf{w}(t)$ і $\mathbf{v}(t)$.

Скарыстаўшы тоеснасць

$$\left(\sum_{i=1}^{k} a_i^2\right)\left(\sum_{i=1}^{k} b_i^2\right) - \left(\sum_{i=1}^{k} a_i b_i\right)^2 = \sum_{1\le i<j\le k} (a_i b_j - a_j b_i)^2,$$

маем

$$\mathbf{w}(t)^2\mathbf{v}(t)^2 - (\mathbf{w}(t)\mathbf{v}(t))^2 \ge t^{4(n-2)} + t^4 \ge \left(\frac{t^{2(n-2)} + t^2}{2}\right)^2.$$

Па леме 7 ацэньваем дыяметр сячэння

$$\operatorname{diam} \mathcal{S} \asymp_n \frac{(t^{n-2}+1) + \xi t^{n-1}(t^{n-1}+t)}{t^{2(n-2)} + t^2}.$$

а) Пры $0 \le t \le 1/2$ умова $|\mathbf{w}(t)\mathbf{q}| \le 1$ выконваецца аўтаматычна і таму будзе залішняй. У выніку для такіх $t$ будзе справядліва ацэнка

$$\operatorname{mes}_{n-1} U_n(\xi, t) \ll_n \xi t^{n-1}.$$

б) Няхай $1/2 < t \le \kappa_1(n)/\sqrt{\xi}$. Верхняя мяжа для $t$ вызначаецца з умовы, што дыяметр сячэння не большы за дыяметр куба

$$\operatorname{diam} \mathcal{S} \ll_n 1.$$

З лемы 7 атрымліваем

$$\operatorname{mes}_{n-1} U_n(\xi, t) \ll_n \frac{\xi t^{n-3}}{t^{2(n-3)} + 1}.$$

в) Пры $t > \kappa_1(n)/\sqrt{\xi}$ ацэнка па леме 7 будзе неэфектыўная. Таму ацэнім меру інача

$$\operatorname{mes}_{n-1} U_n(\xi, t) \le \operatorname{mes}_{n-1} \left\{\mathbf{q} \in \mathbb{R}^{n-1} : \|\mathbf{q}\|_\infty \le 1,\ |\mathbf{w}(t)\mathbf{q}| \le 1\right\} \ll_n t^{-n+1}.$$

Збіраючы ўсе выпадкі разам, атрымліваем

$$|J_1 - \psi_n(t)| \ll_n \begin{cases} \xi^2 t^{2(n-1)}, & 0 \le t \le 1/2, \\ \xi^2 t^2, & 1/2 < t \le \frac{\kappa_1(n)}{\sqrt{\xi}}, \\ \xi, & \frac{\kappa_1(n)}{\sqrt{\xi}} < t. \end{cases}$$

Пасля спрашчэння, улічваючы, што $\omega_n(\xi, t) = 0$ для $t \ge \xi^{-1} + \xi$, маем

$$|\omega_n(\xi, t) - \psi_n(t)| \ll_n \begin{cases} \xi^2 t^2, & |t| \le \kappa_1(n)\xi^{-1/2}, \\ \xi, & \kappa_1(n)\xi^{-1/2} < |t| \le \kappa_2(n)\xi^{-1}, \\ t^{-2}, & \kappa_2(n)\xi^{-1} < |t|. \end{cases}$$

Тэарэма 2 даказана.

# Спіс літаратуры


[1] Берник В. И. “Применение размерности Хаусдорфа в теории диофантовых приближений”. Acta Arith. 42 (1983), no. 3, 219–253.

[2] Каляда Д. У. “Аб размеркаваннi рэчаiсных алгебраiчных лiкаў дадзенай ступенi”. *Доклады НАН Беларуси*, **56**:3 (2012), c. 28–33.

[3] Коледа Д. В. “О количестве многочленов с заданным числом корней на конечном промежутке”. *Весцi НАН Беларусi. Сер. фiз.-мат. навук*, № 1 (2013), c. 41–49.

[4] Коледа Д. В. “Распределение алгебраических чисел второй степени”. *Весцi НАН Беларусi. Сер. фiз.-мат. навук*, № 3 (2013). c. 54–63.

[5] *Ленг С.* Основы диофантовой геометрии. — М.: Мир, 1986, 446 с.

[6] Baker A., and Schmidt W., “Diophantine approximation and Hausdorff dimension”. Proc. London Math. Soc. 21 (1970), no. 3, 1–11.

[7] Barroero F., “Counting algebraic integers of fixed degree and bounded height”. *Monatshefte für Mathematik* (2013): 1–17.

[8] Beresnevich V., “On approximation of real numbers by real algebraic numbers”. Acta Arith. 90 (1999), no. 2, 97–112.

[9] Bugeaud Y., “Approximation by Algebraic Integers and Hausdorff Dimension”, *J. London Math. Soc.* (2002) 65 (3): 547–559.

[10] Chern S.-J., and Vaaler J. D., “The distribution of values of Mahler’s measure”. *J. Reine Angew. Math.* 540 (2001), 1–47.

[11] Davenport H., “On a principle of Lipschitz”, *J. London Math. Soc.* **26** (1951), 179–183. Davenport H., Corrigendum: “On a principle of Lipschitz”, *J. London Math. Soc.* **39** (1964), 580.

[12] Kaliada D., “On the density function of the distribution of real algebraic numbers”. `arXiv:1405.1627 [math.NT]`

[13] Masser D., and Vaaler J. D., “Counting Algebraic Numbers with Large Height I”. *Diophantine Approximation. Developments in Mathematics.* Vol. 16, 2008, pp. 237–243.



Дзянiс Каляда

Iнстытут матэматыкi, Нацыянальная акадэмiя навук Беларусi,

220072 Мiнск, Беларусь

Эл. пошта: koledad@rambler.ru